УДК 398(=161.3)-055.26:008

# Міфалагема савецкай жанчыны ў беларускай культуры ХХ стагоддзя

**Урбан Г. І.**
*Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск*



*Міфалагема савецкай жанчыны з'яўляецца неад'емным складнікам сучаснай беларускай культуры. Аналіз навуковых прац, прысвечаных вобразу савецкай жанчыны, і беларускіх жаночых часопісаў ХХ ст. дазволіў прасачыць сэнсавыя трасфармацыі міфалагемы жанчыны у час існавання савецкай дзяржавы, а таксама вылучыць яе інварыянтнае ядро. Гэтае ядро сфарміравалася ў 1930-х гадах і ўяўляе сабой вобраз «маці-працаўніцы». Адначасовая максімальная адданасць працы (грамадскаму служэнню) і сям'і з'яўляецца вызначальнай рысай міфалагемы савецкай жанчыны. Паводле іерархіі сацыяльных роляў грамадская дзейнасць займала дамінуючую пазіцыю. Аднак, нягледзячы на гэта, да мацярынскай дзейнасці жанчын выстаўляліся такія ж высокія патрабаванні. Такі двайны стандарт спарадзіў сітуацыю, у якой рэальныя жанчыны не маглі адпавядаць сацыяльным спадзяванням.*

***Ключавыя словы:** беларуская культура, міфалагема савецкай жанчыны, савецкія жаночыя часопісы, жанчына-працаўніца, жанчына-маці.*

(Искусство и культура. — 2013. — № 3(11). — С. 90-94)

# The Mythhologeme of the Soviet Woman in Belarusian Culture of XX Century

**Urban H. I.**
*Belarusian State University, Minsk*

*The mythhologeme of the Soviet woman is an integral part of modern Belarusian culture. Analysis of theoretical sources (scientific papers investigating the representations of Soviet women) and qualitative data (Belarusian journals for women of XX century) allowed us to trace the semantic changes in the mythhologeme of the woman, which took place in the Soviet time and to detect its invariant core. This core, formed in the 1930-s, is presented by the image of 'mother-working woman'. The ultimate devotion to work (service to the community) alongside with maximal allegiance to the family is a specific feature of the mythhologeme of the Soviet woman. In the hierarchy of social roles the dominant position was allocated to public work. However, in spite of that, the requirements to motherhood were as high as to public service. This double appointment lead to the situation in which women could not exhaustively satisfy the expectations of the society.*

***Key words:** Belarusian culture, the mythhologeme of the Soviet woman, Soviet journals for women, mother-working woman, woman-mother.*

(Art and Culture. — 2013. — № 3(101). — P. 90-94)

Репозиторий ВГУ

Асэнсаванне сучаснай культуры немагчымае без суаднясення пэўных яе элементаў з культурай мінулага. Усе культурныя вобразы, альбо міфалагемы, уяўляюць з сябе шматузроўневую сістэму, якая адсылае да міфалагічных уяўленняў розных эпох. У гэтым сэнсе міфалагема савецкай жанчыны, культываванне якой супала па часе са станаўленнем сучаснай беларускай культуры, з'яўляецца яе неад'емным складнікам.

Жаночы вобраз у савецкай культуры ўжо разглядаўся такімі аўтарамі, як А. Гапава, А. Р. Усманава, Т. Вароніч, Ю. Выткоўская, Ю. У. Градскова, А. А. Шабатура, Д. У. Захараў, Т. Дашкова і інш. Яны аналізуюць рэпрэзентацыі савецкіх жанчын у сферы працы, сям'і, сацыяльнай і палітычнай актыўнасці. Дзякуючы названым даследчыкам высветлена схема трансфармацыі прапагандаванага вобразу жанчыны: ад эмансіпаванай, мужчынападобнай рэвалюцыянеркі 1920-х гадоў да актыўнай працаўніцы і маці з 1930-х і ўвесь наступны перыяд. Аднак у названых публікацыях няшмат увагі надаецца

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* hanurbanna@gmail.com – **Г. Л. Урбан**

аналізу такой важнай крыніцы даследавання міфалагемы савецкай жанчыны, як беларускі перыядычны друк.

Мэта артыкула – аналіз міфалагемы савецкай жанчыны ў сінхранічным і дыяхранічным плане.

У ходзе даследавання намі былі прааналізаваныя матэрыялы часопісаў «Беларуская работніца і сялянка» (1924–1931 гг.), «Работніца і калгасніца Беларусі» (1931–1941 гг.), «Работніца і сялянка» (1946–1991 гг.). Гэтыя часопісы (а фактычна – адзін часопіс пад рознымі назвамі) з'яўляліся выданнем ЦК КПБ і мэтай сваёй дзейнасці адкрыта ставілі выхаваўча-асветніцкую, такім чынам з'яўляючыся непасрэдным праваднікам ідэалогіі ў «рабоча-сялянскія масы» жанчын.

Акрамя таго, праца з часопісам дае магчымасць комплекснага аналізу, бо ён змяшчаў разнастайныя матэрыялы (афіцыйныя дакументы, журналісцкія рэпартажы, літаратурныя творы, ілюстрацыі і фотаздымкі), а выходзіў рэгулярна з 1924 г. (за выключэннем толькі ваенных часоў).

Міфалагему савецкай жанчыны мы будзем разглядаць з пункту гледжання іерархіі сацыяльных роляў, прадпісаных уладай. Неабходна адзначыць, што ўяўленне аб жаноцкасці ў савецкі перыяд неаднаразова змянялася, азначаючы розныя стадыі развіцця ідэалогіі.

**Жанчына-працаўніца.** Агульнай якасцю, па якой можна вызначыць міфалагему савецкай жанчыны, з'яўляецца самааддане служэнне грамадству (прадпрыемству, Радзіме, партыі, «Леніну-Сталіну», камунізму). Пры гэтым удзел у любой вытворчасці сам па сабе ўяўляўся спосабам уплываць на ўвесь палітычны працэс і нават пазіцыянаваўся як дзяржаўнае кіраўніцтва:

*Як вольная зязюля*
*Вясною ў лузе,*
*Зажыла жанчына*
*У Совецкім Саюзе.*
*Такой яна стала*
*Дасужай і жвавай,*
*Штодня памагае*
*Кіраваць дзяржавай.*

[1, с. 339]

*Я даярка маладая –*
*Пачотнае званне.*
*Дакажу, як выпаўняюць*
*Партыі заданне.*

[1, с. 358]

Такім чынам, прафесійная і палітычная сферы фактычна зліваліся, і фасадам вобразу савецкай жанчыны з'яўлялася яе роля працаўніцы-«общественницы», актывісткі, будаўніка камунізму, якая, нягледзячы на калектыўны характар працы, нясе асабістую адказнасць за ўсе вытворчыя і сацыяльныя дасягненні. Яскравым прыкладам гэтаму з'яўляюцца шматлікія артыкулы, прысвечаныя працоўным подзвігам пэўнай жанчыны пад красамоўнымі назвамі («Знатная свінарка», «Выдатная звеннявая» і да т. п.).

Трэба адзначыць, што магчымасць такога выйсця жанчын на гістарычную арэну была абумоўлена іх мэтанакіраваным прыпадабненнем да мужчын. З гэтай нагоды расійскі гендэролаг Ю. У Градскова адзначае: «Мужчыны ўяўляліся больш дасканалымі істотамі для стварэння новага грамадскага парадку, а жанчыны мусілі пазбавіцца некаторых псіхалагічных рыс і стаць падобнымі да мужчын» [2]. У сістэме каштоўнасцей кожнай жанчыны ўдзел у сацыялістычнай працы і іншая сацыяльная актыўнасць мусілі заняць дамінуючае становішча, якія выціснулі традыцыйныя каштоўнасці мацярынства і сям'і. Рысы характару «новай жанчыны» – мужнасць, адвага, рашучасць, прынцыповасць, адданасць ідэалам, гераізм – таксама былі традыцыйна мужчынскімі. Псіхалагічнае прыпадабненне падмацоўвалася падабенствам знешнім: на выявах 1920-х гадоў целасклад, выраз твару, пастава жанчын з'яўляюцца па-мужчынску моцнымі і суровымі.

Асаблівым пунктам ідэалагічнай прапаганды з'яўлялася авалоданне жанчынамі мужчынскімі прафесіямі. Звычайнымі былі ўслаўленні наступнага кшталту: «Жанчына – работніца на заводзе, жанчына – інжынер, жанчына на паравозе, на трактары, жанчына з адбойным малатком у шахце, жанчына ў навуковай лабараторыі, жанчына на быстракрылым знішчальніку ў паветры – усё гэта стала ў нас звычайным з'явішчам» [1, с. 57–58].

Наогул, па словах Ю. У. Градсковай, «афіцыйны статус «новай савецкай жанчыны» вызначаўся яе здольнасцю добра працаваць на дзяржаўным прадпрыемстве» [2].

Репозиторий ВГУ

Сама назва адзінага ў БССР часопіса для жанчын – «Работніца і сялянка» – сведчыць пра тое, што гэтыя сацыяльныя ролі з'яўляліся вызначальнымі: «В пролетарском обществе трудящаяся женщина ценна прежде всего, как полезный член коллектива, как товарищ по борьбе за рабочее дело, за социалистическое строительство» [3, с. 22].

**Жанчына-маці.** Працоўная актыўнасць жанчыны падпарадкоўвала сабе, а да 1930-х гадоў – нават выцясняла мацярынскія клопаты аб дзецях. У першыя гады савецкай улады выказваліся ідэі перадачы ўсяго працэсу догляду і выхавання дзяцей дзяржаве. На практыцы гэта ніколі ў поўнай меры не ажыццявілася, але прапаганда дзяржаўнага выхавання ў яслях і дзіцячых садах была вельмі моцная. Ад сапраўды неабходнай ініцыятывы па вызваленні часу жанчыны для працы папулярызацыя дзіцячых садоў перайшла да сцвярджэння іх перавагі перад сям'ёй («Дома яны гэтага не мелі б», «Чужыя» выхоўваюць лепш, чым «свае») і нават фактычнай заменай. У часопісе 1932 года з відавочным захапленнем апавядаецца пра тое, як «… яслі працуюць круглыя суткі. Маці прыносіць дзіця пасьля выходнага дня, пакідае яго ў ясьлях на ўвесь рабочы тыдзень і забірае толькі ў наступны свой выходны дзень (за выключэннем грудных)». Такі рэжым аўтарам артыкула ацэньваецца надзвычай добра, бо «зараз работніцы … маюць магчымасьць вольны час да і пасьля работы аддаваць навучаньню, партыйным і грамадскім абавязкам». Яслі «канчаткова вызвалілі свабодную работніцу-грамадзянку ад кухні, пялёнак і кругласутачных клапотаў аб дзецях» [4, с. 11].

У гэтым жа артыкуле закранаецца праблема частых дзіцячых захворванняў (вызваленнем ад якіх, дарэчы, нібыта з'яўляецца кругласутачны ясельны рэжым). Сутнасць жа праблемы бачыцца не ў тым, што хваробы дрэнныя самі па сабе, як шкода дзіцячаму здароўю, а таму, што маці падчас хваробы дзіцяці не выходзіць на працу, ёй прыходзіцца аплочваць бальнічныя лісты, урэшце – не выконваецца прамфінплан [4, с. 11]. На гэтым прыкладзе добра прасочваюцца, па-першае, іерархія сацыяльных роляў, а па-другое – характэрнае змяшэнне прыватна-сямейнай, працоўнай і палітычнай сфер.

Сітуацыя адасаблення маці ад дзяцей, калі кожны мае сваё асобнае шчаслівае жыццё, прызнавалася нармальнай. Менавіта такая сітуацыя паўстае ў дзіцячым вершы «Мая мама»:

*Мая мама на заводзе*
*Ля чугуннага станка…*
*Ў пяць гадзін яна прыходзе*
*Пасля трэцяга гудка.*
*Мама, мама, дарагая,*
*Твая моладасць – завод*
*Твае дні, як кветкі мая,*
*Ружавеюць ў цьвеце год!*
*Шчасьце зьзяе перад намі,*
*Кожны долі сваёй рад…*
*Папрашу сягоння маму,*
*Каб прышла ў дзіцячы сад.*

[5, с. 25]

Разам з тым, нягледзячы на тое, што жанчына пазбаўлялася магчымасці (альбо, як сцвярджалася, – «вызвалялася ад неабходнасці») праводзіць дастаткова часу са сваімі дзецьмі, адказнасць за вынік іх выхавання з яе ні ў якім разе не здымаўся. Наадварот, выхаванне дзяцей – «новай змены» – пазіцыянавалася як задача дзяржаўнай важнасці, ускладзеная на кожную жанчыну-маці. Часопісы 1920-х гадоў стракацелі педагагічнымі заклікамі: «Труженицы города и деревни! Растите здоровую крепкую смену, воспитывайте надежных проводников лен[ин]ских заветов» [6, с. 22]. Ю. У. Градскова, апісваючы сацыяльны статус савецкіх жанчын, адзначае, што «жанчына апыналася ў безвыходным становішчы: з аднаго боку «новая ўлада» патрабавала яе працы для грамадства, а з іншага – заяўляла пра неабходнасць задавальнення вынікаў яе мацярынскай працы больш высокім стандартам, чым тое было раней» [2].

Сітуацыя двайнога стандарту ў патрабаваннях да жанчыны ўзмацнілася ў 1930-х гадах, калі краіна ўзяла курс на экстэнсіўны шлях эканамічнага развіцця. Бурны рост народнай гаспадаркі патрабаваў новых кадраў, якія неабходна было не толькі «выкаваць», але і літаральна стварыць: «Нашы жанчыны, моцныя фізічна, бадзёрыя духам, не павінны сябе калечыць, шкодзіць свайму здароўю абортамі. Жанчына нашага Саюза павінна даць прыгожае, здаровае пакаленне нашай выдатнай сацыялістычнай радзіме» [7, с. 17].

У 1936 годзе была прынята пастанова ЦВК і СНК СССР «Аб забароне абортаў,

Репозиторий ВГУ

павелічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам, устанаўленні дзяржаўнай дапамогі шматсямейным, расшырэнні сеткі радзільных дамоў, дзіцячых ясляў і дзіцячых садоў, узмацненні крымінальнага пакарання за неплацеж аліментаў і аб некаторых зменах у законадаўстве аб разводах». Гэтая пастанова, па сутнасці, з'яўлялася дакументам, які абавязваў грамадзян СССР захоўваць сям'ю і нараджаць дзяцей.

З гэтага часу бярэ свой пачатак ідэалагема «шчаслівай савецкай сям'і», у якой жанчына ізноў надзялялася традыцыйнымі ролямі маці, жонкі і гаспадыні дома. Выхаваўчая роля маці была ўзаконена ў пастанове ЦК ВКП(б) «Аб Міжнародным комуністычным жаночым дні 8 сакавіка» 1938 года, дзе адзначалася, што «выхаванне нашых дзяцей, нашага будучага пакалення, г. зн. нашай будучыні з'яўляецца адной з важнейшых задач жанчыны» [8].

**Маці-працаўніца.** Аналізуючы ідэалагічныя працэсы канца 1920-х гадоў, расійскі гісторык А. А. Шабатура адзначае, што ў рэпрэзентацыі жанчыны перастае дамінаваць адзін бок сацыяльнага статусу – грамадска-палітычны альбо сямейна-бытавы, наадварот – адбываецца іх сумяшчэнне, што становіцца характэрнай рысай жаночага вобразу напрацягу ўсяго савецкага перыяду [9, с. 23]. Паспяховасць і, нават, «нармальнасць» жанчыны вызначалася высокімі паказчыкамі ў працы і нараджэннем, і выхаваннем дзяцей у роўнай ступені.

Напрыклад, у часопісе 1946 г. надрукаваны артыкул, прысвечаны Ірыне Ждановіч, у якім адзначаецца, што яна «не толькі выдатная актрыса, але і актывістка, добрая гаспадыня, пяшчотная маці» [10, с. 10]. Тут рэпрэзентуюцца ўсе дазволеныя сацыяльныя ролі – яе прафесія (у дадзеным выпадку – актрыса – не шараговая, але тым больш гераіня прыцягальная і можа з'яўляцца сацыяльным эталонам); грамадская работа, падмацаваная верай у прапагандаваныя ідэалы (відаць, менавіта гэта хаваецца за словам «актывістка»); сям'я – размежаваная на ролі гаспадыні дома і маці.

Да сярэдзіны 60-х гадоў жаночы вобраз так ці інакш палітызаваўся: жанчына паўставала як свабодная і ўроўненая ў правах з мужчынам Кастрычніцкай рэвалюцыяй і сталінскай Канстытуцыяй; як дэлегатка, камсамолка, рабселькорка, актывістка; як самаадданая працаўніца на карысць Радзімы. Пастаянна падкрэслівалася выгаднае адрозненне савецкай жанчыны ад жанчыны дарэвалюцыйнага, заходнебеларускага альбо капіталістычнага грамадства.

З другой паловы 1960-х гадоў такая палітызаванасць начыста знікае. Першымі тэмамі часопіса становяцца становяцца зразумелыя жанчынам псіхалагічныя замалёўкі («Будзь шчаслівая!», «Славім жанчыну!»). Артыкулы, прысвечаныя святу 8 сакавіка, не з'яўляюцца больш пералікам дасягненняў Савецкага Саюза ў вырашэнні «жаночага пытання», а становяцца больш асабістымі і сапраўды віншавальнымі.

Таксама прыкладна з гэтага часу – з 1950-х гадоў – у часопісах знікаюць кідкія плакатныя выявы жанчын, патрабаванні да іх стылю жыцця (спосабу працы, манеры апранацца і паводзіць сябе і г. д.) істотна змякчаюцца.

1970-я гады характарызуюцца спробай асэнсаваць жанчыну як такую, без абавязковага суаднясення з вытворчай і палітычнай сферай. Менавіта ў гэты час на старонках часопісаў жаночы вобраз пачынае не проста рэпрэзэнтавацца, але і аналізавацца. Частымі становяцца пералічэнні ўслаўленых жаночых якасцяў: прыгажосці, працавітасці, сардэчнасці, пяшчотнасці. Да 1980-х гадоў гэтая тэндэнцыя даходзіць да ўзнясення класічнай, альбо традыцыйнай, жаноцкасці і аднясення яе да разраду каштоўнасці: «... жанчына ўсё больш і больш аддаляецца ад выканання сваёй галоўнай ролі, якую вызначыла сама прырода. Чуваць рашучыя заклікі перагледзець прывычны стэрэатып, які ставіць жанчыну-маці на другое месца пасля жанчыны працаўніцы <...> Але ж тут размова не пра моду, а пра каштоўнасці, якія нездарма называюцца вечнымі. Жанчына, яе ўзвышаны вобраз – менавіта з ліку такіх каштоўнасцей» [11, с. 1].

**Заключэнне.** Міфалагема жанчыны ў савецкі перыяд зведала поўны цыкл трансфармацый: ад катэгарычнага адмаўлення патрыярхальных стэрэатыпаў мінулага праз вяртанне мацярынства як неад'емнага складніка жаночага вобразу да тугі па жаноцкасці як «вечнай каштоўнасці».

Паводле расійскага філолага і культуролага Т. Дашковай, «ідэалагічныя формы (і формулы), у найбольш «чыстым» выглядзе» функцыянуюць у савецкай культуры



Репозиторий ВГУ

1930-гадоў. Таму «зварот менавіта да гэтага перыяду дазваляе выявіць «інварыянты» тых ідэалагічных клішэ, з «варыянтамі» якіх мы працягваем сутыкацца дагэтуль» [12]. Такім чынам, вобраз савецкай жанчыны 1930-х гадоў – гэта тое ядро міфалагемы савецкай жанчыны, якое працягвае бытаваць і ў сучаснай культуры і, верагодна, будзе трансляванае ў наступныя эпохі. Савецкая жанчына 1930-х гадоў, а значыць, і «савецкая жанчына» наогул – гэта «маці-працаўніца» (Т. Вароніч), якая мае моцную шчаслівую сям’ю і актыўна ўдзельнічае ў жыцці працоўнага калектыву.

Асобнымі тэмамі ў пэўныя перыяды з’яўляліся «жанчына і мір», «жанчына і вайна», «жанчына і фізкультура» і інш. Але гэтыя вобразы прынцыпова не ўплывалі на міфалагему савецкай жанчыны наогул, з’яўляючыся яе актуальнымі «ілюстрацыямі» (напрыклад, «салдацкая маці»/«партызанская мадона» і «салдатка»/«падпольшчыца» як варыянт «маці-працаўніцы»).

Такі інтэгральны вобраз савецкай жанчыны, ідэальны на першы погляд, пасутнасці з’яўляўся дысгарманічным, бо кожную з гэтых дзвюх сацыяльных роляў неабходна было выконваць насуперак другой, але пры гэтым максімальна добра. Савецкая ідэалогія не толькі не прымірыла грамадскае і прыватнае ў жыцці жанчыны, але і сутыкнула гэтыя сферы ў пастаянным праціборстве, прымушаючы жанчыну жыць двайным жыццём.

Ніводная з прапанаваных у савецкі час мадэляў жыцця не была выказана «з пункту гледжання жанчыны», гаворачы сучаснай феміністычнай мовай. Ні прыпадабненне да мужчыны і пазбаўленне сябе жаночых якасцяў, ні натужныя спробы сумяшчэння прынцыпова розных сацыяльных роляў (прынамсі, прапанаваным максімалісцкім спосабам), ні «рэакцыйнае» акружэнне сябе арэолам выключнасці і пераўтварэнне ў абстрактную «вечную каштоўнасць» не з’яўляліся сапраўды жаночымі шляхамі. Якія гэтыя шляхі – задача, якую вырашае сучасная культура, якая з аскепкаў мінулага ставрае новую міфалагему жанчыны.

## ЛІТАРАТУРА

1. Жанчына ў беларускай народнай творчасці / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі, секцыя этнаграфіі і фальклора. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1940. – 518 с.

2. Градскова, Ю. В. «Обычная» советская женщина – обзор описаний идентичности / Ю. В. Градскова // Гендерные исследования. Центральноазиатская сеть [Электронный ресурс]. – 2004–2011. – Режим доступа: http: //www.genderstudies.info/social/s03.php. – Дата доступа: 27.07.2012.

3. Как одеваться? / Беларуская работніца і сялянка. – 1928. – № 6. – С. 22.

4. П. На круглыя суткі / П. // Работніца і калгасніца Беларусі. – 1932. – № 8. – С. 11.

5. Мая мама // Беларуская работніца і сялянка. – 1928. – № 4. – С. 25.

6. Беларуская работніца і сялянка. – 1928. – № 1. – С. 22.

7. Майзель, М. Б. Шкоднасць абортаў / М. Б. Майзель // Работніца і калгасніца Беларусі. – 1935. – № 17. – С. 17.

8. Аб Міжнародным комуністычным жаночым дні 8 сакавіка. Пастанова ЦК ВКП(б) // Работніца і калгасніца Беларусі. – 1938. – Фонд 1.

9. Шабатура, Е. А. Образ «новой женщины» в советской культуре 1917 – 1929 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. А. Шабатура. – Омск. гос. пед. ун-т. – Омск, 2006.

10. Ірына Ждановіч // Работніца і сялянка. – 1946. – № 1. – С. 10.

11. «Хай жанчына жанчынаю будзе». Інтэрв’ю з М. М. Яроменка // Работніца і сялянка. – 1988. – № 3. – С. 1–2.

12. Дашкова, Т. Идеология в лицах: Формирование визуального канона в советских женских журналах 1920-х – 1930-х годов / Т. Дашкова // Институт европейских культур [Электронный ресурс]. – 1995 – 2002. – Режим доступа: http: //www.iek.edu.ru/projects/pptdash3.htm. – Дата доступа: 26.11.2012.

*Паступіў у рэдакцыю 09.04.2013 г.*

Репозиторий БГУ